**Адказнасць за безбілетны праезд і выкарыстанне падробленых дакументаў, якія прадастаўляюць права на бясплатны праезд.**

У апошні час пачасціліся выпадкі выкарыстання грамадзянамі дакументаў, якія ім не належаць і прадастаўляюць права на бясплатны праезд, а таксама падробленых пасведчанняў і дакументаў, у тым ліку даведак, што выдаюцца навучальнымі ўстановамі. У адпаведнасці з артыкулам 18.28. Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 06.01.2021 г. № 91-З, безбілетны праезд пасажыраў на ўсіх відах гарадскога транспарту, а таксама праходжанне кантрольнага турнікета (лініі кантролю) у метрапалітэне без наяўнасці дакумента, які пацвярджае права на праезд, цягне за сабой накладанне штрафу ў памеры ад пяці дзясятых да адной базавай велічыні.

Акрамя таго, за падобныя правапарушэнні, у адпаведнасці з артыкулам 380 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, суд, акрамя штрафу, можа прызначыць пакаранне ў выглядзе папраўчых работ тэрмінам да двух гадоў, арышту – тэрмінам да шасці месяцаў, абмежавання свабоды – тэрмінам да двух гадоў. А за паўторнае ўчыненне або ўчыненне такога злачынства групай асоб па папярэдняй змове – пазбаўленне волі тэрмінам да трох гадоў.